За правы чалавека

Віцебскі рэгіянальны праваабарончы бюлетэнь

№ 1 (96) 1-15 студзеня 2015 г.

Камітэт па правох чалавека прызнаў парушэньне правоў Анатоля Стамброўскага



Камітэт ААН па правох чалавека апублікаваў рашэньне па звароце № 1987/2010, прынятае на 112-й сэсіі камітэту. Згодна з гэтым рашэньнем, Рэспубліка Беларусь як краіна – удзельнік Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правох прызнаная парушальніцай правоў віцебскага актывіста Анатоля Стамброўскага, прадугледжаных пунктам 2 артыкулу 19 пакту.

У сваёй скарзе ў КПЧ Анатоль Стамброўскі сцьвярджаў, што ён зьяўляецца ахвярай парушэньня Беларусьсю ягоных правоў. 3 красавіка 2009 году ён хацеў зладзіць адзіночны пікет у пешаходнай зоне на скрыжаваньні дзьвюх вуліц Віцебску з мэтай прыцягненьня грамадзкай увагі да парушэньняў заканадаўства органамі ўлады. Аднак Віцебскі гарвыканкам правядзеньне пікету забараніў.

Гарвыканкам адзначыў, што правядзеньне пікету нібыта парушыла б дарожны рух, парадак перамяшчэньня людзей, грамадзкую бясьпеку і парадак. У забароне пікету было адзначана таксама, што прапанавае актывістам месца яго правядзеньня не ўваходзіць у сьпіс дазволеных для правядзеньня масавых мерапрыемстваў месцаў, у той час як згодна з пастановай гарвыканкаму грамадзкія мерапрыемствы можна ладзіць толькі ў некалькіх канкрэтна пазначаных месцах у Віцебску.

Анатоль Стамброўскі абскардзіў рашэньне аб забароне пікету ў судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску, сьцьвярджаючы, што гарвыканкам парушыў яго канстытуцыйнае права на свабоду выказваньня меркаваньняў. Актывіст спрабаваў давесьці суду, што прычына забароны пікету, які нібыта замінаў бы дарожнаму руху, зьяўляецца надуманай і неправамернай, бо адзін чалавек, што стаіць у пешаходнай зоне на скрыжаваньні вуліц, наўрад ці зрабіў бы такое.

Аднак райсуд не прыслухаўся да аргумэнтаў актывіста і, спаслаўшыся на тое, што пастанова Віцебскага гарвыканкаму адпавядае палажэньням Закону Рэспублікі Беларусь «Аб масавых мерапрыемствах», пакінуў скаргу без задавальненьня. Потым нібыта правільнасьць такога рашэньня суду Кастрычніцкага раёну Віцебску пацьвердзілі Віцебскі абласны суд, куды падаваліся касацыйная і наглядная скаргі, і Вярхоўны Суд, куды таксама падавалася скарга згодна з працэдурай перагляду ў парадку нагляду. Такім чынам, суды прызналі, што палажэньні Закону «Аб масавых мерапрыемствах» зьяўляюцца дэ-факта вышэйшымі за канстытуцыйную норму, згодна зь якой кожны грамадзянін мае права на свабоду выказваньня меркаваньняў.

Камітэт па правох чалавека, куды ў рэшце рэшт паскардзіўся віцебскі актывіст, некалькі разоў спрабаваў дамагчыся ад уладаў Беларусі тлумачэньняў па сутнасьці скаргі. Але беларускія ўлады адмовіліся даць такія тлумачэньні. Яны адно заявілі, што скарга Стамброўскага не павінна была рэгістравацца камітэтам, бо аўтар звароту ў камітэт нібыта ня вычарпаў усіх даступных сродкаў прававой абароны ўнутры краіны, уключаючы падачу ў пракуратуру хадайніцтва пра перагляд у парадку нагляду рашэньня, якое ўступіла ў сілу.

Падчас камунікацыі з КПЧ улады Беларусі адзначылі, што паведамленьне Дамброўскага і шэраг іншых паведамленьняў былі зарэгістраваныя нібыта ў парушэньне Факультатыўнага пратаколу да Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правох, а таму любыя рашэньні, прынятыя камітэтам у дачыненьні да гэтых паведамленьняў, будуць уважацца за юрыдычна несапраўдныя. Таксама беларускія ўлады заявілі, што яны не абавязаныя прызнаваць правілы

(працяг на стар. 2)

Мітрапаліт Павал назваў Беларусь часткай "Сьвятой Русі"

Кіраўнік Беларускай праваслаўнай царквы (БПЦ Маскоўскага патрыярхату) заклікаў народы Беларусі, Расеі і Украіны імкнуцца да "духоўнай еднасьці". Пра гэта мітрапаліт Менскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Павал заявіў у сваім сёлетнім калядным пасланьні.



"Усе мы — беларусы, расейцы і украінцы — павінны ўсьведамляць сваю адказнасьць за захаваньне ўнікальнай цывілізацыйнай прасторы, якая называецца — Сьвятая Русь. І ў той самы час гэта зусім не азначае адмену ідэі дзяржаўнага сувэрэнітэту трох славянскіх краін", — сказаў кіраўнік БПЦ у калядным пасланьні.

Патрыяршы Экзарх адзначыў, што імкненьне да міру, згоды і адзінства — маральная патрэба чалавека ва ўсе часы. Ён таксама падкрэсьліў, што праваслаўе і сёньня "застаецца асновай нацыянальнага самавызначэньня пераважнай большасьці насельніцтва трох славянскіх краін - Беларусі, Расеі і Украіны, якая перажывае цяпер трагедыю грамадзянскай вайны".

"Ва ўмовах палітычнай дэзінтэграцыі Царква для народаў, што яе складаюць, застаецца змацавальным саюзам. Для праваслаўнага чалавека — гэта адзіная духоўная прастора, якая мае агульны для гэтай часткі Эўропы культурна-цывілізацыйны код", — сказаў прадстаяцель БПЦ.

"Расея, Украіна, Беларусь - гэта і ёсьць Сьвятая Русь", - падкрэсьліў мітрапаліт Павал.

Ён пажадаў усім праваслаўным "нявычэрпнай дабрадатнай дапамогі Божай у далейшых працах у славу сьвятой праваслаўнай Царквы, у славу Айчыны нашай, на карысьць і росквіт зямлі, на якой мы з вамі жывём, на карысьць усім нашым блізкім і далёкім".

Камітэт па правах чалавека прызнаў парушэньне правоў Анатоля Стамброўскага

(пачатак на стар. 1)

працэдуры КПЧ і тлумачэньне ім палажэньняў Факультатыўнага пратаколу і што спасылкі на практыку камітэту, якая даўно склалася, не зьяўляюцца для яго юрыдычна апраўданымі.

У рашэньні па справе Дамброўскага КПЧ асобна пракамэнтаваў адмову Беларусі ад супрацоўніцтва з камітэтам: «Камітэт нагадвае, што ў адпаведнасьці з пунктам 2 артыкулу 39 Пакту ён мае права вызначаць свае ўласныя правілы працэдуры, якія дзяржавы-ўдзельнікі пагадзіліся прызнаваць. Ён далей адзначае, што ў сілу далучэньня да Факультатыўнага пратаколу дзяржава — удзельнік Пакту прызнае кампэтэнцыю Камітэту прымаць і разглядаць паведамленьні ад асобаў, якія сьцьвярджаюць, што яны зьяўляюцца ахвярамі парушэньня якога-небудзь з правоў, выкладзеных у Пакце (прэамбула і артыкул 1 Факультатыўнага пратаколу). З далучэньня да Факультатыўнага пратаколу вынікае абавязак дзяржавы добрасумленна супрацоўнічаць з Камітэтам, з тым каб ён мог разглядаць такія паведамленьні, і пасьля іх вывучэньня накіроўваць сваю Пазыцыю дзяржаве-ўдзельніку і зацікаўленай асобе (пункты 1 і 4 артыкула 5). З гэтымі забавязаньнямі несумяшчальныя любыя дзеяньні дзяржавы-ўдзельніка, якія будуць замінаць ці перашкаджаць Камітэту ў разглядзе і вывучэньні паведамленьня, а таксама ў фармуляваньні ім сваіх Пазыцыяў. Камітэт упаўнаважаны самастойна вызначаць, ці трэба рэгістраваць паведамленьне. Камітэт адзначае, што, не прызнаючы яго кампэтэнцыю ў гэтым пытаньні і загадзя заяўляючы, што яна ня будзе прызнаваць рашэньня Камітэту ў дачыненьні да прымальнасьці і сутнасьці паведамленьня, дзяржава-ўдзельнік парушае свае забавязаньні, прадугледжаныя артыкулам 1 Факультатыўнага пратаколу да Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах».

Нягледзячы на пярэчаньні ўладаў Беларусі, камітэт палічыў скаргу Стамброўскага прымальнай і разгледзеў яе па сутнасьці. Вынік разгляду такі: «Дзяржава-ўдзельнік не прадставіла ніякіх заўвагаў па сутнасьці гэтага паведамленьня... Мясцовыя ўлады дзяржавы-ўдзельніка забаранілі аўтару паведамленьня правядзеньне пікету 3 красавіка 2009 году, абмежаваўшы такім чынам ягонае права на распаўсюд ягонага меркаваньня пра дзейнасьць уладаў дзяржавы-ўдзельніка... Нацыянальныя органы не патлумачылі, якім чынам падчас правядзеньня адзіночнага пікету ў пешаходнай зоне аўтар можа парушыць дарожны рух, парадак перамяшчэньня людзей, грамадзкую бясьпеку і парадак у названым месцы, і як абмежаваньні правоў аўтара паведамленьня, прадугледжаных артыкулам 19 Пакту, абгрунтоўваюцца пунктам 3 артыкулу 19 Пакту. Пры гэтых акалічнасьцях і з улікам таго, што ад дзяржавы-ўдзельніка не паступіла ніякай інфармацыі па гэтым пытаньні ў абгрунтаваньне ўстанаўленьня абмежаваньня дзеля мэтаў, прадугледжаных у пункце 3 артыкулу 19 Пакту, Камітэт робіць выснову пра тое, што правы аўтара паведамленьня, прадугледжаныя пунктам 2 артыкулу 19 Пакту, былі парушаныя».

Цяпер улады Беларусі абавязаныя забясьпечыць Анатолю Стамброўскаму эфэктыўны сродак прававой абароны, уключаючы пакрыцьцё панесеных ім судовых выдаткаў і кампэнсацыю. Згодна з рашэньнем КПЧ, у мэтах забесьпячэньня поўнага ажыцьцяўленьня ў краіне правоў, прадугледжаных артыкулам 19 Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах, Беларусь мусіць пераглядзець унутранае заканадаўства. Таксама дзяржава абавязаная зрабіць захады па недапушчэньні зьдзяйсьненьня ёй аналягічных парушэньняў у будучыні.

Рашэньне, прынятае Камітэтам ААН па правах чалавека па скарзе Анатоля Стамброўскага, — далёка ня адзінае ў шэрагу падобных. Цягам апошніх некалькіх гадоў КПЧ прызнаў дзясяткі выпадкаў парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі. Найчасьцей беларусы скардзяцца на парушэньне Беларусьсю артыкулу 19 пакту, які забясьпечвае права на свабоду выказваньня меркаваньняў і распаўсюд інфармацыі. Аднак беларускія ўлады, нягледзячы на ўзятыя дзяржавай на сябе міжнародныя забавязаньні, упарта адмаўляюцца выконваць рашэньні камітэту. Ці зьменіцца нешта цяпер, і ці выканаюць улады патрабаваньні камітэту гэтым разам?

Вёска пад Віцебскам больш за месяц жыве без вады

Вёска Шылкі знаходзіцца прыкладна ў 25 кілямэтрах ад Віцебску, амаль на мяжы зь Сеньненскім раёнам. Тут, ня лічачы дачнікаў, 9 жылых хатаў, у пераважнай большасьці якіх жывуць пэнсіянэры, і з пачатку сьнежня ў іх няма крыніцы вады.

У спадчыну ад ліквідаванага калгасу і малочна-таварнай фэрмы ў Шылках засталася помпавая станцыя з воданапорнай вежай, яна і сілкавала тры вясковыя калёнкі. Вада была так сабе — зь зялезным прысмакам і пакідала моцны накіп на посудзе — аднак была.

Паводле расказаў вясковых жыхароў, на пачатку сьнежня падчас моцнага ветру ў Шылках ноччу некалькі разоў зьнікала электрычнасьць. Пасьля гэтай «рабінавай ночы» і перастала працаваць помпавая станцыя. Жыхары вёскі засталіся без уласнай крыніцы вады.

Звароты вяскоўцаў да кіраўніцтва сельсавету і мясцовага саўгасу з просьбай адрамантаваць помпу посьпехам не ўвянчаліся: начальства адказвала пэнсіянэрам, што ні тэхнічных, ні фінансавых сродкаў для рамонту ня маецца. Маўляў, выкручваецца самі. Нават цэнтралізаванага падвозу вады для людзей, якія жывуць тут, за месяц арганізаваць ніхто не знайшоў часу.

Пэнсіянэры, якія ўсё жыцьцё прапрацавалі ў сельскай гаспадарцы, яшчэ і цяпер трымаюць жывёлу: трусоў, кароў, у адной жанчыны ёсьць конь. Найбліжэйшая крыніца вады знаходзіцца ў суседняй вёсцы Скрыдлёва — да калёнкі, якая працуе, прыкладна паўтара кілямэтру ад Шылак. Ці пад сілу пажылым людзям, а найстарэйшай жыхарцы далёка за восемдзесят, нацягаць пры такой адлегласьці вады сабе і сваім гадаванцам?

Дзьмітрыеўна, якая пераехала сюды пры канцы 1980-х з Крыму — муж захацеў вярнуцца на Радзіму, распавядае, як выкручваюцца вяскоўцы, пра якіх забыліся улады:

— Ва ўсе ёмістасьці, якія ёсьць, зьбіраем дажджавую і адталую ваду. Вось цяпер пасьля адлігі і сьнегападу набегла — змагу прыбраць у пакоі. Дапамагае суседка, у якой ёсьць конь — прывезла бітон вады. Але ёй самой цяжка — акрамя каня самотная жанчына трымае яшчэ двух кароў, дык што даводзіцца прасіць жыхароў Скрыдлёва, каб яны загадзя набіралі для яе ваду. Сёньня прыяжджаў зь Віцебску сын, змаглі папоўніць запас вады.

Пажылая жанчына раз-пораз ня можа ўтрымаць сьлёзы:

— Мы ж нічога ні ў каго ня просім, сена і салому самі нарыхтоўваем. Але няўжо не заслужылі сваёй працай і падаткамі на старасьці хоць бы вады? Бо карове не патлумачыш, што зламалася помпа, яна не чалавек, які будзе трываць, яна просіць піць.

Адзін з жыхароў вёскі мае калодзеж, ён трохі ратуе, але піць такую ваду забараніла санстанцыя — вакол балота і вада небясьпечная для здароўя.

Паводле словаў вяскоўцаў праблемы з вадой у іх вёсцы назіраюцца амаль штогод, асабліва пасьля таго як у Шылках ня стала фэрмы. Аднак гэтым разам, па іх уражаньні, паломку ўжо ніхто не зьбіраецца ліквідаваць і мясцовых жыхароў проста кінулі на волю лёсу.

Падпалкоўнік юстыцыі: Нам непрыемна, што вы здымаеце будынак Сьледчага камітэту



Сябры КХП-БНФ давалі тлумачэньні ў Сьледчым камітэце наконт знойдзеных імі парэшткаў меркаваных ахвяраў масавых расстрэлаў у лесе пад вёскай Хайсы Віцебскага раёну. Калі партыйцы выйшлі з будынку СК, мясцовыя незалежныя журналісты папрасілі іх адказаць на пытаньні з запісам на відэа. Але ледзь пасьпелі журналісты ўключыць відэакамэру, як з будынку Сьледчага камітэту выйшаў афіцэр, які папрасіў спыніць здымкі.

На пытаньне Яна Дзяржаўцава, які пачаў быў даваць інтэрвію журналістам, — «Мы штосьці парушылі?» — прагучаў адказ: «Вы нічога не парушылі. Але вы павінны разумець, што гэта рэжымны аб'ект, і здымкі без дазволу кіраўніцтва гэтага аб'екту ня вельмі прыемныя нам як супрацоўнікам гэтага аб'екту».

Супрацоўнік СК, які папрасіў спыніць відэаздымкі, быў чалавек у чыне падпалкоўніка юстыцыі, начальнік аддзелу апэратыўна-дзяжурнай службы Ўпраўленьня сьледчага камітэту па Віцебскай вобласьці Вячаслаў Бысеў. Ён прадставіўся і паводзіўся карэктна. Але пры гэтым так і не патлумачыў, на падставе якога закону трэба мець дазвол на здымкі і ўзгадненьне зь ягоным кіраўніцтвам.

«Вы робіце гэта на фоне ўпраўленьня Сьледчага камітэту. Я мяркую, што вы можаце гэтыя відэаздымкі выкарыстаць у нейкіх нядобрых, не пажаданых для нас мэтах, — так спадар падпалкоўнік патлумачыў сваю просьбу. — Таму прапаную здымкі спыніць, аддаліцца ад будынку на "бясьпечную адлегласьць" — ды працягнуць рабіць тое, што вы робіце, але крыху наводдаль ад будынку».

Журналісты і ўдзельнікі відэаздымак зрабілі так, як папрасіў афіцэр.

Інцыдэнт пракамэнтаваў Ян Дзяржаўцаў, у якога журналісты бралі прыпыненае падпалкоўнікам Бысевым інтэрвію: «Не пасьпеў я сказаць два-тры дзясяткі словаў незалежнаму журналісту з нагоды нашага візыту да сьледчай, як да нас выйшаў ажно цэлы начальнік аддзелу апэратыўнай дзяжурнай службы і папрасіў пакінуць межы "рэжымнага аб'екту". На вялікі жаль, праваахоўныя органы бароняць не правы тутэйшых грамадзян, а бясьпеку існага тут рэжыму ды свой адносны дабрабыт».

Сяргей Каваленка выйшаў на волю

Пасьля дзесяці сутак арышту з ізалятару часовага ўтрыманьня на волю выйшаў сябра КХП БНФ Сяргей Каваленка. Ён быў затрыманы 24 сьнежня 2014 году. 27 сьнежня пастановай Першамайскага райсуду Віцебску актывіст быў абвінавачаны ў зьдзяйсьненьні дробнага хуліганства паводле артыкулу 17.1 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях.



Сапраўднай жа прычынай затрыманьня Сяргея Каваленкі стаў вывешаны на даху аднаго з дамоў Віцебску бел-чырвона-белы сьцяг. І хаця ніякіх доказаў датычнасьці Каваленкі да гэтага факту ў міліцыянтаў не было, адказваць давялося менавіта яму.

Ад самага моманту затрыманьня Сяргей Каваленка быў ня згодны з высунутым супраць яго абвінавачаньнем і на знак пратэсту абвясьціў галадоўку. Тым больш, як распавёў актывіст, першы дзень знаходжаньня ў ізалятары яму давялося правесьці на паверсе, дзе месьціцца затрыманыя паводле крымінальных артыкулаў. Гэты факт ён расцаніў, як своеасаблівы ціск на яго з боку абвінавачваньня.

Да таго ж Сяргею не дазволілі зьвязацца адвакатам, а на судовы працэс прывезьлі ў кайданках. Абурыў віцебскага актывіста і той факт, што адзінымі сьведкамі выступілі міліцыянты, якія яшчэ і блыталіся ў сваіх сьведчаньнях.

Сяргей Каваленка лічыць, што падзеі, за якім яму давялося назіраць апошнім часам, цяжка лічыць нейкай аб'ектыўнай рэальнасьцю. Таму ён успрымае ўсё, што адбывалася вакол яго, як нейкі цырк, тэатар клоўнаў: клоўны – судзьдзі, клоўны – міліцыянты; вось толькі невядома, хто напісаў ім іхныя рэпрызы.

Абвешчаньне галадоўкі ён лічыць своеасаблівай адмовай ад удзелу ў сплянаванай кімсьці клаўнадзе. Паводле словаў Сяргея Каваленкі, у гэтакіх умовах галадоўка сталася адзіна магчымай праявай волі для паняволенага грамадзяніна, які мае права быць вольным паўсюль. Галадоўка дае магчымасьць захаваць годнасьць і застацца чалавекам.

Асабліва абурыў Сяргея выпадак, калі пасьля напісаньня ім напярэдадні Новага году скаргі, праваахоўнікі запыталіся ў яго пра наяўнасьць зімовага абутку і гэткім чынам пасеялі надзею на датэрміновае вызваленьне — маўляў, можаш сустрэць сьвята ў сямейным коле. Верылася ў гэта слаба, таму асаблівых перажываньняў з-за нязьдзейсьненых спадзяваньняў не было. Хаця непрыемны асадак застаўся.

Пасьля свайго выхаду на волю Сяргей Каваленка падзякаваў усім, хто падтрымліваў і перажываў за яго падчас суду і ўтрыманьня ў ІЧУ.

Мытны саюз з Расеяй у дзеяньні: Віцебскаму прадпрымальніку забаранілі выпускаць прадукцыю з этыкеткай на беларускай мове

Віцебскі прадпрымальнік сутыкнуўся з дыскрымінацыяй беларускай мовы, калі вырашыў наладзіць выпуск новай прадукцыі з этыкеткай па-беларуску. Аказваецца, з уступленьнем Беларусі ў Мытны саюз, уся прадукцыя, якая выпрабляецца ў краіне, згодна з рэглямэнтам МС, павінна маркіравацца на расейскай мове. Пра гэта прадпрымальнік напісаў на форуме belarus.d3.ru.

— Аказваецца, у нас цяпер этыкеткі на беларускай — па-за законам.

Я ў сябе ў Віцебску спрабую разьвіваць невялічкую харчовую вытворчасьць. Ня ўсім жа валізамі гандляваць, хтосьці і ў рэальным сэктары мусіць працаваць. Дык вось, вырашыў я ў Новы год ўвайсьці з новай прадукцыяй. Арганізаваў вытворчасьць дыетычных хлябцоў з суцэльнага збожжа. Рысавыя, пшанічныя, грачаныя. Правёў дасьледаваньне рынку, закупіў і наладзіў абсталяваньне, надрукаваў этыкеткі. Усяго ў мяне чатыры віды хлябцоў, і вырашыў я на адзін зь іх ляпіць этыкетку на беларускай мове. А на астатнія тры — на расейскай.

Зрабіў пробную партыю, аддаў у санстанцыю на аналіз, усё ў парадку. Цяпер трэба ісьці ў Цэнтар стандартызацыі для атрыманьня важнай паперы — дэклярацыі аб адпаведнасьці. Гэта апошні этап, пасьля яго — адразу на паліцу ў краму. Але дзе там. Цэнтар стандартызацыі адмовіў мне ў выдачы важнай паперы на тыя хлябцы, што зь беларускай этыкеткай. Кажуць, якая такая беларуская мова? Пішыце на расейскай.



Я спачатку падумаў было, што гэта жарт. Кажу, вось жа, ёсьць дзяржаўны стандарт СТБ 1100-2007, у ім у п. 4.3 сказана, што этыкетка на тавары можа быць на беларускай і/або расейскай. Ён што, пытаюся, ня дзейнічае больш? А мне ў адказ: дзейнічае. Але яшчэ ў нас цяпер дзейнічае Тэхнічны рэглямэнт Мытнага саюзу 022-2011, дзе сказана (п. 1 арт. 4.1), што ўсе тавары цяпер павінны маркіравацца на расейскай мове, а пры вялікай ахвоце можна прадубляваць на беларускай або казахскай. Але расейская павіннна быць абавязкова.

Карацей, сказалі мне, выкідвай партыю этыкетак на сваёй беларускай, і замаўляй новую — на расейскай. То бок расейская мова ў нас цяпер ГАЛОЎНЕЙШАЯ. Вось гэткая ў нас роўнасьць у МС. І пляваць Маскве на нашу Канстытуцыю і элемэнтарныя нормы прыстойнасьці.

Бюлетэнь "За правы чалавека" выдаецца праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
Наклад 299 асобнікаў.
Пры падрыхтоўцы бюлетэня выкарыстоўваліся матэрыялы сайта http://prava.vitebsk.cc і іншыя Інтэрнэт-рэсурсы.